*Л. Ф. Голікава*

# БЕЛАРУСКІЯ КАМПАЗІТАРЫ НА ЗАХАДЗЕ: КУЛЬТУРНЫ І МІЖКАНФЕСІЯНАЛЬНЫ ТВОРЧЫ ДЫЯЛОГ

Многаколерную карціну развіцця нацыянальнай культуры немагчыма прадставіць без імёнаў вядомых на Захадзе беларускіх кампазітараў-эмігрантаў – М. Равенскага, М. Куліковіча-Шчаглова, Э. Зубковіч, А. Карповіча, К. Кіслага, В. Селях-Качанскага, Д. Верасава, Х. Барысаўца, П. Звоннага і інш., творчасць якіх застаецца прыкладам шчырага служэння айчыннаму мастацтву, а адданая творчая праца садзейнічае шанаванню беларускай нацыянальнай музыкі, яе распаўсюджанню за мяжой.

Першы творчы дыялог з замежнай культурай пачынае выдатны кампазітар і тэарэтык-крытык Алесь Карповіч (1909–1992), ураджэнец в. Азёркі Гродзенскай вобласці, якога напаткаў лёс эмігранта. Апантаны творчасцю сваіх суайчыннікаў, ён знаёміць заходнееўрапейскую публіку з творамі «невядомых беларусаў» – М. Равенскага, М. Куліковіча, Э. Зубковіч і прысвячае шэраг артыкулаў іх музычнай спадчыне, асабліва «фальклорнаму накірунку» ў творчасці; такую цікавасць можна растлумачыць агульным эміграцкім лёсам музыкантаў.

Сярод іх – Мікола Равенскі (1886–1953), кампазітар і таленавіты этнограф, які вывучаў і апрацоўваў народныя песні, а потым выкарыстоўваў іх у сваёй творчасці. Ён стаяў ля вытокаў прафесійнага музычнага мастацтва Савецкай Беларусі і зрабіў важкі ўклад у станаўленне вакальных (песні, хары, вакальныя ансамблі) і музычна-драматычных (опера, аперэта) нацыянальных «па духу» твораў.

Апынуўшыся пасля Другой сусветнай вайны ў Лювене (Бельгія) і атрымаўшы пост музычнага дырэктара беларускага каледжа пры Лювенскім універсітэце, М. Равенскі адразу пачаў наладжваць творчы дыялог з універсітэцкай моладдзю. Створаны ім пад патранатам французскага кардынала Эўгена Цісерана студэнцкі хор адразу прыцягнуў увагу слухачоў незнаёмым рэпертуарам, складзеным з беларускіх народных і аўтарскіх (М. Равенскага) твораў. Былы выхаванец Лювенскага ўніверсітэта ўспамінаў, што, «прафесар Равенскі пачаў вельмі сур’ёзна працаваць з заснаваным хорам» і, дзякуючы яго «настойлівай і нястомнай працы», першы канцэрт, які адбыўся 18 снежня 1950 г. у вялікай зале ўніверсітэта,

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

меў «поспех незвычайны» [2, с.63–64]. Менавіта захапляльныя водгукі ў прэсе аб выступленні гэтага творчага калектыву стымулявалі знакамітага брэтонца, адваката, аматара і знаўцу беларускай музыкі Гая дэ Пікарду зацікавіцца творчасцю М. Равенскага, якому ён прысвяціў шэраг выдатных публікацый.

Сам кіраўнік хору і кампазітар, натхнёны цёплым прыёмам замежнай публікай яго ўласных сачыненняў, а таксама твораў беларускай народнай музыкі, спецыяльна для выканання мужчынскім хорам (з 16 чалавек) перапрацаваў сваю вядомую «Літургію сьв. Яна Златавуста». Працуючы з 1952 г. універсітэцкім капеланам беларускіх студэнтаў, М. Равенскі пачынае працу над аранжыроўкай сінадальных кантаў, прызначаных для рукапалажэння святароў шэўстанскага бенедыкцінскага кляштара ў Паўднёвай Бельгіі, тым самым пачынаючы міжканфесіянальны творчы дыялог з заходнееўрапейскай царквой. У гэтым жа годзе ён запісвае некалькі пласцінак з беларускімі народнымі песнямі ў сваёй апрацоўцы, а таксама некаторыя рэлігійныя творы свайго сачынення.

Творчасць М. Равенскага заўсёды падпітвалася фальклорнымі інтанацыямі, была першапачаткова песеннай, вакальнай па паходжанні і глыбока нацыянальнай і таму выклікала нязменны інтарэс з боку заходніх навукоўцаў. Невыпадкова, што з пачатку 50-х гг. кампазітар пачынае цесна супрацоўнічаць з Беларускім інстытутам навукі і мастацтва, які адкрываецца ў Нью-Ёрку (1952 г.). Там ён працуе над навуковым даследаваннем «Характэрныя рысы беларускай народнай песні» (якое з-за хваробы, на жаль, не паспеў завяршыць), пераканана сцвярджаючы, што беларуская песня па сваёй меладычнасці, лірычнасці займае адно з першых месцаў у сусветнай музычнай фальклорнай спадчыне.

Па накіраванасці творчасці М. Равенскі – пераважна вакальны кампазітар, і, хаця сярод яго твораў няшмат інструментальных, сутнасць прыроды музычнага мыслення кампазітара чыста вакальнага паходжання. Ён належыць да тых творцаў, чый «музычны почырк» пазнаецца амаль адразу беспамылкова і ў чыёй музыцы глыбока індывідуальнае, аўтарскае зліваецца з агульнанародным у самым высокім сэнсе гэтага слова, калі «народнае» фарміруе «генетычны код творцы, яго нацыянальны дух» [3, с.248] і надае яго сачыненням нацыянальную афарбоўку і асобую напеўнасць.

БІБЛІЯТЭКА БГУКІ

Невыпадкова, што фальклорныя матывы знайшлі сталае ўвасабленне ў творах М. Равенскага, у тым ліку і ў невялікіх па маштабах царкоўных творах, змешчаных у зборніку «Літургія», асобы каларыт якім надаюць як нацыянальна-характэрныя меладыйныя народна-песенныя інтанацыйныя абароты, так і сапраўдныя цытаты, прафесійна апрацаваныя кампазітарам (у «Херувімскай № 2» цытуецца народная песня «Ці свет, ці світае»).

Царкоўныя хары М. Равенскага вызначаюцца выдатным спалучэннем глыбокай духоўнасці, лірычнасці, эмацыянальнасці з багаццем і разнастайнасцю аўтарскіх апрацовак фальклорных матываў, што, несумненна, дазваляе паставіць яго ў адзін рад з выдатнымі стваральнікамі духоўнай харавой музыкі – рускімі кампазітарамі XVIII ст. М. Беразоўскім і Д. Бартнянскім, на фарміраванне харавога стылю якіх аказвала непасрэднае ўздзеянне мілагучнасць украінскага песеннага меласу. Як адзначае А. Карповіч, царкоўная музыка М. Равенскага, нацыянальна адметная і разам з тым прасякнутая рэлігійным пачуццём, – «сапраўды духоўная музыка». У сваіх духоўных сачыненнях кампазітар выпрацоўвае своеасаблівае вакальна-харавое пісьмо, як у знакамітым гімне «Магутны Божа» на словы Н. Арсенневай (1946), ці ў папулярным гімне «О, Божа ўсеўладны», які з вялікім поспехам выконваўся Лювенскім студэнцкім хорам не толькі ў Бельгіі, але і ў Парыжы разам з іншымі свецкімі і духоўнымі творамі кампазітара.

Вялікі рэзананс на Захадзе атрымала і творчасць Міколы Куліковіча-Шчаглова (1897–1969). Выдатны адукаваны музыкант, таленавіты кампазітар (аўтар опер, аперэт, сімфоній, канцэрта, харавой музыкі), прафесар, дырыжор хароў і аркестраў, піяніст, рэжысёр-пастаноўшчык музычна-драматычных твораў (оперы, балета, тэатральных і эстрадных прадстаўленняў), навуковец, фалькларыст, даследчык гісторыі беларускага музычнага мастацтва і нацыянальнага музычнага фальклору, – усё гэта напрамкі яго творчай дзейнасці.

Талент М. Куліковіча-кампазітара быў разнастайным, але перавагу ў сваёй творчасці ён заўсёды аддаваў музыцы вакальнай ці вакальна-драматычнай, абапіраўся на фальклорныя традыцыі (народную песню ён добра ведаў, хаця амаль не цытаваў). І разам з дасягненнямі ў фальклорным напрамку кампазітар быў схільны да рознага роду «стылёвых эксперыментаў», дабіваўся аўтэнтычнасці свайго творчага почырку абранай – у адпаведнасці з пастаўленымі

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

мэтамі і задачамі – стылістыцы: у яго творах адчуваецца ўздзеянне стылёвых асаблівасцей позняга рамантызму, неабарока, «кучкісцкіх» традыцый, а таксама творчага почырку знакамітага стваральніка харавой царкоўнай музыкі і буйнога кампазітара А. Кастальскага, які аказаў вялікае ўздзеянне на фарміраванне харавога стылю М. Куліковіча. Як сведчыць Г. дэ Пікарда, «быў ён вельмі кампетэнтны, дырыгаваў сімфанічным аркестрам Беларускага радыё, пісаў сюіты, рамансы, музыку для фартэпіяна, таксама прыгожую, – і ўсё гэта *беларуская* музыка… Да вайны паўсюдна ў Савецкім Саюзе музыку Шчаглова ігралі <…> Калі там (у Маскве. – *Л.Г.*) рэцэнзавалі сімфоніі, дык аглядалі творчасць двух кампазітараў – Куліковіча і Шастаковіча» [4].

Апынуўшыся ў эміграцыі, спачатку ў Германіі, М. Куліковіч працуе над стварэннем нацыянальна афарбаваных твораў харавой царкоўнай музыкі («Літургія св. Яна Хрызастома» і «Усяночная», абедзве – 1948 г.), дзе, як і ў «Велікодным каноне», выкарыстоўвае папеўкі беларускіх народных песень.

Шырока вядомай, пачынаючы з 1950-х гг., творчасць М. Куліковіча становіцца ў ЗША, дзе ён разам з жонкай, былой салісткай Кіеўскай і Венскай опер Надзеяй Градэ, актыўна ўключаецца ў творчы працэс, вядзе канцэртную і грамадскую працу: гастралюе з канцэртамі па Злучаных Штатах і Канадзе, прымае ўдзел ва ўрачыстасцях беларускай супольнасці, дае ўрок музыкі, кіруе хорам уніяцкай царквы Хрыста Збавіцеля ў Чыкага, займаецца навуковай фалькларыстычнай і музыказнаўчай дзейнасцю. Яго навуковыя публікацыі – манаграфіі «Беларуская музыка. Кароткі нарыс гісторыі беларускага музычнага мастацтва» (Частка I. Нью-Ёрк, 1953)[1], «Савецкая беларуская опера» (Мюнхен, 1957) і інш. – прываблівають чытача глыбокім навуковым аналізам, тонкімі і трапнымі заўвагамі, бліскучым літаратурным стылем.

Творчы дыялог М. Куліковіча з паўночнаамерыканскай публікай развіваецца надзвычай актыўна. З аднаго боку (з боку прыхільнікаў таленту кампазітара), гучаць захопленыя водгукі ў СМІ аб разнастайнасці яго музычных прыярытэтаў, з другога – з’яўляюцца новыя творы музыканта, створаныя ў галіне песеннага нацыянальнага фальклору, харавых царкоўных напеваў каталіцкай традыцыі, якія ён гарманізуе («Сэрца Ісуса», «Вітай, Марыя»), а

[1]Асноўнае месца ў выданні адведзена даследаванню вытокаў беларускай народнай музыкі, без засваення якіх, на думку кампазітара, нельга зразумець перспектывы развіцця прафесійнай музычнай творчасці на Беларусі.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

таксама публікацыі песенных зборнікаў – «Беларускі песенны зборнік» (1954), «Калядоўшчыкі», «Беларускія песні і танцы для акардэона» (1960), у які ўвайшлі амаль сто твораў у розных жанрах – песень, танцаў, рамансаў, балад, у тым ліку аўтарскія кампазіцыі «Пагоня», «Ад родных ніў», «Летам», «О, Беларусь, мая шыпшына», «Васількі», «Песня каліноўцаў» і інш., «Беларускі царкоўны спеўнік».

Шэраг песень, якія піша кампазітар, прызначаны для выканання як у праваслаўнай, так і каталіцкай традыцыі (харавыя царкоўныя творы «Иже херувимы», «Тебе поем», «Милость мира» і інш.).

Творчая спадчына М. Куліковіча багатая на разнастайныя тэмы і жанры, яго музычная мова – надзвычай меладыйная і выразная, песенная ў сваёй аснове і нацыянальна афарбаваная, што сведчыць аб дасканалым і глыбокім веданні кампазітарам нацыянальнага музычнага фальклору, яго асаблівасцей, што спасцігаліся праз практычнае засваенне фальклорных узораў, праз няспынную – на працягу ўсяго творчага жыцця – «работу» з песняй, дэталёвае вывучэнне яе «знутры», адчуванне яе мелодыка-інтанацыйных нюансаў. Таму апрацоўкі і гарманізацыя народных песень (М. Куліковічам гарманізавана іх больш за 600) займаюць адметнае месца ў творчасці кампазітара, хаця ён амаль не цытуе фальклорных узораў, стварае свае тэмы «ў характары» народных, што сведчыць аб дасканалым засваенні творцай багатай фальклорнай спадчыны.

Царкоўная музыка, стварэнню якой М. Куліковіч прысвяціў палову свайго эмігранцкага творчага жыцця, займае значнае месца ў спадчыне кампазітара. Выдатны знаўца фальклору, М. Куліковіч і ў арыгінальных асабістых рэлігійных кампазіцыях спрабаваў аб'яднаць характэрныя асаблівасці народнай песні з кананізаванымі многагалоснымі праваслаўнымі і каталіцкімі царкоўнымі песнапеннямі і, тым самым, імкнуўся аднавіць традыцыі беларускай царкоўнай музыкі.

У рэлігійных творах – «Усяночная», «Літургія сьв. Яна Златавуста» (1948), «Велікодным каноне», «Милости мира», «Иже херувимы», «Тебе поем» і інш. – кампазітар абапіраўся на беларускі, рускі і ўкраінскі нацыянальны мелас, шчасліва спалучаючы народна-песенныя інтанацыі з выдатным веданнем кампазіцыйнай тэхнікі і добрай агульнатэарэтычнай адукаванасцю. Імкненнем М. Куліковіча было ідэнтыфікаваць сваё кампазітарскае пісьмо з народна-песеннымі і царкоўна-пеўчымі музычна-моўнымі

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

элементамі ў апрацоўках духоўных твораў у традыцыях народнай музыкі (што знайшло ўвасабленне, напрыклад, у апрацоўцы песень XVI–XVIII стст. з беларускага зборніка «Ірмалагіён», зробленых кампазітарам у 1959 г.).

Харавое пісьмо М. Куліковіча абапіралася таксама і на дасягненні яго папярэднікаў – кампазітараў канца XIX – пачатку XX стст. – П. Чайкоўскага, А. Кастальскага, С. Рахманінава і інш. у галіне царкоўна-пеўчага мастацтва. У харавой фактуры царкоўных хароў М. Куліковіч выкарыстоўвае прыёмы імітацыйна-падгалосачнай поліфаніі разам з строгай гарманічнай вертыкаллю харавога гучання, з выдзяленнем вядучага голасу, у якім праводзіцца галоўны песенна-тэматычны (часцей за ўсё – фальклорны) элемент. Па словах сучаснага даследчыка, М. Куліковіч «…пісаў цэлыя літургіі, заснаваныя на народных тэмах, і гарманізаваў мноства старых беларускіх напеваў», якія сёння гучаць «не горш за Рахманінава» [4].

Царкоўныя харавыя творы М. Куліковіча і пасля смерці кампазітара былі запатрабаваны рознымі рэлігійнымі канфесіямі, пастаянна ўключаліся ў зборнікі царкоўнай музыкі, якія выдаваліся ў Лондане, – «Беларускі царкоўны спеўнік» (1979), «Беларускі духоўны спеўнік» (1989), «Беларускі царкоўны спеўнік – II» (1991). Гэтыя зборнікі твораў «прынеслі Куліковічу славу аднаго з найвялікшых майстроў еўрапейскай царкоўнай музыкі» [5, с.316].

Увогуле творчасць М. Куліковіча прадстаўляе сабой яркую старонку ў гісторыі прафесійнага беларускага музычнага мастацтва, а яго дасягненні ў галіне царкоўнай музыкі – значны ўклад у сусветную рэлігійную музычную літаратуру. М. Куліковіч – «цікавы і самабытны мастак, які вабіць да сябе найперш выразнай нацыянальнай адметнасцю, пошукамі нацыянальнай музычнай мовы і стылю» [7, с.58] і, дададзім, беларускай арыентаванасцю музычнай спадчыны.

Значэнне творчасці кампазітараў беларускага замежжа «як крыніцы беларускай музычнай культуры» [6, с.61] надзвычай вялікае. Як верна адзначае сучасны даследчык, «бессэнсоўна …вывучаць гісторыю Беларусі без гісторыі беларусаў у свеце <…> не ўлічваць уклад беларусаў у культуру» [1, с.103] іншых краін і сваю, бо без духоўных здабыткаў творчасці айчынных і «замежных» беларускіх творцаў немагчыма праўдзівая, аб’ектыўная і цэласная гісторыя нацыянальнай культуры.

БИБЛИОТЕКА БГПУ

1. *Грыцкевіч В.* Як пераадолець адставанне гістарычнай навукі Беларусі / В. Грыцкевіч // Беларусіка=Albaruthenica. Кн. 1. / рэд. А. Мальдзіс [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – С. 103.

2. *Жучка, Я.* Вучоба ў Лювенскім універсітэце / Я. Жучка // Культура беларускага замежжа / пад. рэд. А. Сабалеўскага. – Мінск: Бел. навука, 1998. – Кн. 3. – 192 с.

3. *Конан, У.* Эстэтычныя погляды Вацлава Ластоўскага / У. Конан // Беларусіка=Albaruthenica / рэд. В. Рагойша, Г. Цыхун, Э. Шыбек. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – Кн. 4. – 382 с.

4. *Пікарда, Г.* [Інтэрв'ю] / вяла С. Берасцень // Літаратура і мастацтва. – 1992. – 27 ліст.

5. *Пікарда, Г.* Беларускія эміграцыйныя спеўнікі і вакальныя партытуры (1944–1994) / Г. Пікарда // Беларусіка=Albaruthenica. Кн. 5. / рэд. У. Конан, А. Мальдзіс. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 359 с.

6. *Пікарда, Г. дэ.* Старонкі гісторыі беларускай царкоўнай музыкі / Г. Пікарда // Беларусіка=Albaruthenica. Кн. 2. / рэд. А. Анціпенка [і інш.]. – Мінск: Нац. навук.-асвет. цэнтр імя Ф. Скарыны, 1992. – 403 с.

7. *Сяргіенка, Р.* Знаходкі ў архіўных сховішчах / Р. Сяргіенка // Мастацтва. – 1992. – № 11. – С. 58.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ